З першых вуснаў

# «ГАТОВЫ АКАЗАЦЬ ВАМ УСЯЛЯКУЮ ПАДТРЫМКУ»

## Прэзідэнт правёў дзве міжнародныя сустрэчы з першымі лэдзі афрыканскіх краін

### «МЫ ВЕЛЬМІ ХОЧАМ ЗРАБІЦЬ НЕШТА КАРЫСНАЕ ДЛЯ НАРОДА ЗІМБАБВЭ»

**Спачатку ў Палацы Незалежнасці віталі першую лэдзі Зімбабвэ Аксілію Мнангагва.** У сваёй краіне яна курыруе сферы аховы здароўя, падрыхтоўкі кадраў, арганізацыі дзіцячага харчавання. Беларусь актыўна дапамагае калегам з Зімбабвэ па гэтых кірунках. Адпаведныя дамоўленасці былі дасягнуты падчас візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Зімбабвэ ў 2023 годзе і затым падчас першага візіту Аксіліі Мнангагва ў Беларусь. Гэтым разам з першай лэдзі прыехала дэлегацыя, у складзе якой прадстаўніцы самых розных сфер — горназдабыўной, сельскагаспадарчай, банкаўскай, інфармацыйнай і турыстычнай. Іх чакае насычаная культурная праграма, у цэнтры якой — наведванне міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Аднак у графіку дэлегацыі і нямала сустрэч рабочага характару, бо гуманітарнае супрацоўніцтва — добрая падтрымка для ўмацавання гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння.

«Я вельмі рады, што вы прыбылі да нас у дні славянскай культуры і маленькі кавалак зімбабвійскай культуры прывезлі да нас. Вы нашы адносіны да вас і вашай краіны, да вашага Прэзідэнта добра ведаеце. Мы гатовы аказаць вам усялякую падтрымку і паслугі падчас вашага знаходжання ў Беларусі», — сказаў беларускі лідар, вітаючы госцю. Ён нагадаў, што ў Беларусі чакаюць візіту прэзідэнта Зімбабвэ Эмерсана Мнангагвы. Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што беларускі бок акажа ўсялякае садзейнічанне ў рэалізацыі ўсіх дамоўленасцяў і планаў.

«Ведаю, што вас суправаджаюць прадстаўнікі бізнес-колаў Зімбабвэ. Добра, што гэта жанчыны. Яны больш уважлівыя і глядзяць на ўсё найлепшае, што ёсць у Беларусі, і на тое, што мы гатовыя рэалізоўваць сумесна з вамі ў тым ліку ў Зімбабвэ», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што Аксілія Мнангагва ўзяла на сябе вельмі цяжкую ношу і задачы, якія вельмі важныя для Зімбабвэ, — гэта ахова здароўя і дзіцячае харчаванне. «Будзьце ўпэўненыя, што ў гэтым плане мы заўсёды будзем побач з вамі і зробім усё неабходнае, каб палепшыць сітуацыю ў Зімбабвэ з медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва і харчаваннем для дзяцей», — запэўніў беларускі лідар. Па яго словах, у Беларусі і Зімбабвэ вялікія сумесныя планы і ў іншых сферах: «Мы вельмі хочам працаваць у вашай краіне і зрабіць нешта карыснае для народа Зімбабвэ. Вы можаце разлічваць на нас».

У сваю чаргу Аксілія Мнангагва падзякавала Аляксандру Лукашэнку за падтрымку Зімбабвэ.

**❍ У тэму**

Размаўляючы з журналістамі, першая лэдзі Зімбабвэ адзначыла, што Прэзідэнт Беларусі — сапраўдны мужчына і сапраўдны лідар. Аксілія Мнангагва заўважыла, што некаторыя сумесныя праекты Беларусі і Зімбабвэ актуальныя не толькі для гэтых дзвюх краін, але і для ўсяго Афрыканскага кантынента. «У нашай гісторыі яшчэ не было прыкладаў супрацоўніцтва такога маштабу. Зімбабвэ мае ўнікальнае геаграфічнае размяшчэнне, наша супрацоўніцтва з Беларуссю можа распаўсюдзіцца на іншыя краіны, і такі маштаб супрацоўніцтва сапраўды вельмі важны для нас», — сказала Аксілія Мнангагва.

Сваімі планамі і ідэямі наконт супрацоўніцтва з Беларуссю падзяліліся і члены дэлегацыі, якія прыехалі разам з першай лэдзі. Мэрыт Мунцвембры ўзначальвае дэпартамент тэлевяшчання навін і агульных пытанняў Зімбабвійскай тэлерадыёкампаніі. Яна падкрэсліла, што ёй цікавая праца беларускіх калег. «Мы хацелі б пераймаць той досвед, які ёсць у беларусаў. Магчыма, праводзіць праграмы па абмене досведам, каб пераймаць тэхнічныя аспекты. Мы адзначылі гэта падчас размовы з Прэзідэнтам, і я хацела б яму падзякаваць за тое, што ён нас пачуў», — сказала яна. Чыпо Мажынду працуе ў сферы турызму. Па яе словах, Беларусь для жыхароў Зімбабвэ — новы турыстычны напрамак, які абяцае быць вельмі цікавым. Яна адзначыла, што была прыемна ўражана, як цёпла беларусы сустракаюць сваіх гасцей. Эрыка Мапуранта, якая працуе ў сферы горназдабыўной прамысловасці, заўважыла, што дамоўленасці, дасягнутыя падчас візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Зімбабвэ, выконваюцца. Яна таксама падкрэсліла, што ў горназдабыўной прамысловасці Зімбабвэ вельмі карысная беларуская тэхніка. Ёй задаволены і зімбабвійскія аграрыі. Пра гэта расказала фермер Дэфін Мбанжэ. Мандас Марыканда, генеральны дырэктар Зімбабвійскага жаночага мікрафінансавага банка, падкрэсліла, што ім цікавы прыклад Беларусі ў развіцці жаночага прадпрымальніцтва. Яна распавяла, што Зімбабвійскі жаночы мікрафінансавы банк будзе ўсяляк у гэтым удзельнічаць.

### «МЯРКУЮ, ШТО МЫ БУДЗЕМ ВАМ КАРЫСНЫЯ»

**У графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на сераду таксама была ўключана і сустрэча з першай лэдзі Нігерыі Алурэмі Цінубу,** якая першы раз наведвае нашу краіну. Аднак яе візіт не азнаямляльны, а мае мэтай дасягненне канкрэтных дамоўленасцяў на перспектыву.

«Я вельмі хацеў бы спадзявацца, што пасля вашага візіту адбудзецца візіт і прэзідэнта, і вашых міністраў у Беларусь для таго, каб мы пачалі больш цесна супрацоўнічаць. Нам вельмі цікавая ваша краіна, і мяркую, што мы будзем вам карысныя. Перадайце, калі ласка, прэзідэнту Болу Цінубу мае самыя добрыя пажаданні і скажыце яму, што мы гатовыя яго прыняць у любы зручны для яго час», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, вітаючы госцю. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі добра ведаюць патрэбы і магчымасці Нігерыі, а супрацоўніцтва з гэтай краінай для беларускага боку вельмі важнае. «І мы можам значна дапамагчы вам, як і вы нам акажаце значную дапамогу ў развіцці. Мы гатовы аказаць вам дапамогу і падтрымку як у развіцці прамысловасці, так і ў развіцці сельскай гаспадаркі, перапрацоўчай прамысловасці, асабліва ў вытворчасці прадуктаў харчавання. А таксама гатовы ствараць у вас прадпрыемствы па вытворчасці розных відаў тэхнікі. Мы гатовы падключыцца да падрыхтоўкі спецыялістаў у розных галінах у вашай краіне, а таксама да больш глыбокага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі», — прапанаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы папрасіў арганізаваць візіт міністра замежных спраў Максіма Рыжанкова ў Нігерыю, каб выпрацаваць план далейшага супрацоўніцтва.

Алурэмі Цінубу перадала беларускаму лідару цёплыя пажаданні ад свайго мужа прэзідэнта Нігерыі Болу Цінубу і паабяцала яшчэ вярнуцца ў нашу краіну.

**❍ У тэму**

Размаўляючы з журналістамі, Алурэмі Цінубу ахарактарызавала Аляксандра Лукашэнку як чалавека з вялікім сэрцам, які гатовы дапамагаць краіне, сябрам, што вельмі важна цяпер. Яна асабліва адзначыла дзелавы настрой беларускіх калег: «Беларусы — вельмі сур'ёзныя людзі. Яны адразу гатовы працаваць. Адразу з самалёта пачаліся рабочыя сустрэчы. Такі сур'ёзны падыход беларусаў вельмі важны для нас. Мы стараемся пабудаваць новую краіну, таму такі настрой вельмі важны». Па яе словах, прэзідэнт Нігерыі разумее важнасць сяброўскіх адносін і яму хацелася атрымаць інфармацыю з першых вуснаў. «Мы не так шмат ведаем пра Беларусь, таму важна даведацца ўсё на месцы. Даведаліся мы вельмі шмат. Гэта надзейны партнёр для нас і ў сферы адукацыі, і ў сферы сельскай гаспадаркі, якія асабліва для нас важныя. Вярнуўшыся дадому, я змагу расказаць гэта яму», — адзначыла першая лэдзі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Міжнародныя стасункі

# «МЫ СЯБРУЕМ З УСІМІ, ХТО СЁННЯ ТРЫМАЕЦЦА МІРАЛЮБІВАЙ ПАЛІТЫКІ»

## Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчы з першымі лэдзі Нігерыі і Кыргызстана

***Жонкі прэзідэнтаў Федэратыўнай Рэспублікі Нігерыя і Кыргызскай Рэспублікі Алурэмі Цінубу і Айгуль Жапарава прыбылі ў Беларусь якраз у дні, калі адкрываецца «Славянскі базар». Аднак культурнай праграме высокіх гасцей папярэднічалі сур'ёзныя дзелавыя сустрэчы.***

### Ад міжпарламенцкага дыялогу да партнёрства ў маладзёжнай палітыцы

У размове з першай лэдзі Нігерыі Старшыня Савета Рэспублікі акцэнтавала ўвагу на тым, што Беларусь і Нігерыю звязваюць добрыя сяброўскія адносіны і наша краіна гатова да супрацоўніцтва абсалютна па ўсіх кірунках. «Сёння Беларусь з'яўляецца той краінай, якая мае магутны прамысловы патэнцыял, — канкрэтызавала спікер. — Мы выпускаем даволі шмат сельскагаспадарчай тэхнікі. Мы — высокаіндустрыяльная краіна, у нас ёсць высокія тэхналогіі ў розных галінах. Нашы прадукты харчавання і сельская гаспадарка сёння прызнаны практычна ва ўсім свеце. Мы забяспечваем харчовую бяспеку сваёй краіны і пастаўляем на экспарт нямала прадуктаў харчавання — у мінулым годзе на суму звыш 8 мільярдаў долараў».

Па словах Наталлі Качанавай, для Беларусі важным з'яўляецца і супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы. Яна паведаміла, што ў бягучым годзе ў нашай краіне атрымліваюць адукацыю 336 нігерыйскіх студэнтаў. Беларусь гатова і далей даваць гранты для навучання моладзі з гэтай краіны.

Асаблівая ўвага — супрацоўніцтву ў маладзёжнай палітыцы. «Для нас гэта вельмі важна: тады, калі сябруе моладзь, — гэта залог сяброўства нашых краін, — патлумачыла спікер. — Таму маладзёжная палітыка з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў сацыяльнай палітыкі, якая праводзіцца ў нашай краіне».

Беларусь гатова да ўзаемадзеяння і па лініі грамадскіх арганізацый. Вядома, для заканадаўцаў у прыярытэце — міжпарламенцкае супрацоўніцтва. «Ваш візіт у нашу краіну надасць новы імпульс міжпарламенцкаму супрацоўніцтву» , — падкрэсліла Наталля Качанава, звярнуўшы ўвагу на тое, што гэта з'яўляецца іх калегай, сенатарам нігерыйскага парламента.

Алурэмі Цінубу расказала аб парламенцкай дзейнасці ў Нігерыі, сваім сенатарскім вопыце, у цэлым падзялілася, у якіх няпростых умовах прэзідэнту даводзіцца кіраваць гэтай афрыканскай краінай.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на тое, што сустрэча праходзіць у дзень, калі ў Беларусі адзначаецца 30-годдзе інстытута прэзідэнцтва. «30 гадоў таму ў нас была такая ж гісторыя: разгул, бандытызм, разваліўся Савецкі Саюз — і мы апынуліся на развале, — канкрэтызавала спікер. — І нашай краіне пашанцавала: прыйшоў той чалавек, які адвёў краіну ад бездані. Нам пашанцавала, што ў нас такі нацыянальны лідар. Сёння мы гэта дакладна ведаем і разумеем, бо за невялікі прамежак гісторыі — крыху больш як 30 гадоў — у нас сёння высокаразвітая краіна з выдатным чалавечым патэнцыялам. Наш Прэзідэнт жыве праблемамі краіны, сваіх людзей. І таму мы хочам шчыра пажадаць вашаму мужу, Прэзідэнту Нігерыі, каб ён змог вытрымаць усе тыя праблемы, якія сёння ляглі на яго плечы. Вы павінны ведаць, што ў вас ёсць добрыя сябры ў Беларусі. Дакладна ведаю: Аляксандр Рыгоравіч у любую хвіліну гатовы падзяліцца парадай, дапамогай для таго, каб развіваць добрыя адносіны паміж нашымі краінамі. Вы павінны ведаць, што тут, у цэнтры Еўропы, у вас ёсць надзейныя сябры, якія заўсёды побач».

### Развіццё па ўсіх кірунках

Вітаючы першую лэдзі Кыргызстана Айгуль Жапараву ў Савеце Рэспублікі, Наталля Качанава адзначыла: «Беларусь і Кыргызстан — сяброўскія і блізкія краіны, і, вядома, трывалы фундамент гэтым адносінам задаюць нашы прэзідэнты. Важны палітычны дыялог паміж кіраўнікамі нашых дзяржаў — аснова нашых узаемаадносін. Для нас важна супрацоўніцтва з Кыргызстанам абсалютна па ўсіх кірунках».

Па словах спікера, тавараабарот паміж краінамі складае больш як 160 мільёнаў долараў, але, як заўважыла Старшыня Савета Рэспублікі, ёсць да чаго імкнуцца. Кажучы аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве, Наталля Качанава выказала ўдзячнасць, што паміж Беларуссю і Кыргызстанам складваюцца добрыя адносіны. Аб гэтым сведчыць афіцыйны візіт спікера кыргызскага парламента ў нашу краіну ў мінулым годзе. Беларускія парламентарыі, у сваю чаргу, удзельнічалі ў мерапрыемствах МПА СНД у Бішкеку.

Кажучы аб рэалізацыі сумесных праектаў, Наталля Качанава прапанавала кыргызскаму боку правесці сумесны форум, падобны на Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, або Форум жанчын-прадпрымальніц Беларусі і Узбекістана. Яна нагадала, што дзеці з Кыргызстана ўдзельнічалі ў культурна-адукацыйным праекце «Цягнік Памяці». «Патрыятычнае выхаванне моладзі, работа з моладдзю — адзін з прыярытэтных кірункаў нашай парламенцкай дзейнасці», — канстатавала спікер.

У сваю чаргу, Айгуль Жапарава падзякавала за гасціннасць, у асобе спікера павіншавала беларускі народ з Днём Незалежнасці, акцэнтаваўшы ўвагу на тым, што ў дзвюх краін — агульная гісторыя. Першая лэдзі Кыргызстана расказала, што ў нашай краіне знаходзіцца другі раз. «У Беларусі вельмі развіта барацьба з анкалогіяй, у прыватнасці дзіцячай, трансплантацыя ў вас на найвышэйшым узроўні», — канкрэтызавала яна і папрасіла аб дапамозе кыргызскаму боку ў гэтых сферах. Таксама першая лэдзі агучыла просьбу аб магчымасці павелічэння квот для студэнтаў з Кыргызстана. Па меркаванні госці, ёсць патрэба і ў адкрыцці чартарнага рэйса «Мінск — Бішкек», што паўплывае на ўзаемадзеянне і ў турыстычнай сферы.

Рэзюмуючы, Наталля Качанава адзначыла: беларускі бок зробіць усё, што ад яго залежыць. «Нічога няма лепшага, чым асабістыя сустрэчы. Асабістыя кантакты не заменіць ніхто і нішто», — адзначыла ў завяршэнні сустрэчы спікер.

**Вераніка КАНЮТА.**